**Паважаныя дарослыя!**

Прапануемы сшытак — гэта плён маёй шматгадовай працы з дзеткамі па навучанні грамаце. Ён дапаможа навучыцца чытаць хутка, а самае галоўнае — без нуды і прымусу. Акрамя гэтага мы будзем развіваць увагу, дробную маторыку і пашырым слоўнікавы запас на беларускай мове. Дарэчы, у канцы сшытка вы знойдзеце адказы да заданняў. Старайцеся штодзённа ўзгадваць новыя словы і замацоўваць іх.

Усе заданні распрацаваны ў гульнявой форме і размешчаны паступова: ад лёгкага — да больш складанага. Спачатку вы зможаце паўтарыць літары, потым засвоіць чытанне складоў і слоў толькі з літарай *А*, затым мы дабавім склады і словы з літарай *О*, *У* і гэтак далей. Не спяшайцеся пераходзіць да наступнай галоснай, пакуль вашы дзеці не навучацца правільна чытаць словы з папярэдняй літарай.

На тых старонках, дзе змешчаны заданні з дарожкамі складоў, вельмі важна патрэніравацца — прачытаць іх некалькі разоў. Спачатку чытаюць толькі дарослыя, затым разам з дзецьмі, а потым дзеці паспрабуюць зрабіць гэта самастойна. Пры чытанні прапануйце вучням сачыць — дапамагаць сабе пальчыкам альбо алоўкам. Калі дзеці не могуць самастойна напісаць патрэбную літару, пакажыце ім самі альбо знайдзіце для ўзору на старонцы такую ж літару.

Жадаю вам поспехаў! Няхай вучоба прыносіць задавальненне і дзецям, і дарослым!

*Наталля Галко*

Разгледзь уважліва малюнкі. Правядзі лініі і «пасадзі» кожнага матылька на прадмет, назва якога пачынаецца з такой жа літары, што напісана на яго крыльцах.



Разгледзь уважліва малюнкі. Правядзі вожыка па сцежцы некалькі разоў уверх-уніз і праспявай яму пры гэтым песеньку са складоў.

Вызнач, з якога складу пачынаецца назва кожнага прадмета ці звярка на малюнку. Злучы лініямі склады з патрэбнымі малюнкамі (напрыклад, *ВА* — з вавёркай і г. д.).



Прачытай пачатак слова на кубачку, а канец слова знайдзі на сподачку і запішы яго. Магчымы розныя варыянты, адзін і той жа сподак можна выкарыстоўваць некалькі разоў.



Праедзь на машыне па дарожцы некалькі разоў і праспявай пры гэтым песеньку са складоў.

Вызнач, з якога складу пачынаецца назва кожнага прадмета ці жывёлы на малюнку. Злучы лініямі склады з патрэбнымі малюнкамі.



Дапамажы вожыку разблытаць шары. Дапішы склад, прачытай слова і намалюй яго ў пустым шарыку. Чытаць пачынай з чырвонай зорачкі.



Правядзі караблік па ручайку некалькі разоў і праспявай пры гэтым песеньку са складоў.

Вызнач, з якога складу пачынаецца назва кожнага прадмета ці жывёлы на малюнку. Злучы лініямі склады з патрэбнымі малюнкамі.

Расфарбуй малюнкі.



Дапамажы малпачцы ўпісаць прапушчаную літару ў словах.

